**УДК 271-055.2(476.5)“1921/1939”**

# АДУКАЦЫЙНА-ВЫХАВАЎЧАЯ І ДАБРАЧЫННАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЖАНОЧЫХ МАНАСКІХ РЫМСКА-КАТАЛІЦКІХ КАНГРЭГАЦЫЙ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921-1939 ГГ.

***Ю.А. Аўсейчык***
Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Полацк, Рэспубліка Беларусь

*У артыкуле разгледжаны арганізацыя і развіццё ўласных навучальных устаноў манаскіх жаночых рымска-каталіцкіх супольнасцей на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у міжваенны перыяд. Ахарактарызавана праца законніц(манахінь) у дзяржаўных навучальных установах розных форм. Прасочана дабрачынная дзейнасць жаночых манаскіх супольнасцей у рэгіёне. Крыніцамі для даследавання сталі архіўныя і апублікаваныя матэрыялы.*

Значную ролю ў Рымска-Каталіцкай Царкве адыгравае манаства. Жаночая частка манаства ў касцёле падзяляецца на шматлікія кангрэгацыі (на дадзены момант колькасць жаночых манаскіх рымска-каталіцкіх супольнасцей перавышае 3000). Кангрэгацыя (ад лац. “congregatio” – саюз, злучэнне) – рэлігійная супольнасць, аб’яднанне некалькіх манастыроў, якія жывуць па аднаму і таму ж статуту (канстытуцыі). У склад кангрэгацый могуць уваходзіць як духоўныя асобы, так і свецкія.

Пасля Рыжскай мірнай дамовы (18 сакавіка 1921 г.) Заходняя Беларусь увайшла ў склад Польшчы. Згодна з рэлігійна-тэрытарыяльным падзелам заходнебеларускія землі апынуліся ў складзе Віленскай і Пінскай дыяцэзій. Невялікая частка беларускай тэрыторыі, якая складала 7 парафій, належыла да Ломжынскай дыяцэзіі. Аднак трэба адзначыць, на тых беларускіх землях, якія ўваходзілі ў склад Ломжынскай дыяцэзіі, жаночых рымска-каталіцкіх манаскіх супольнасцей у даследуемы перыяд не працавала.

Як сведчаць архіўныя матэрыялы, на сярэдзіну 1930-х гг. у рэгіёне існавала не так многа манаскіх пляцовак. Так, на 1936 г. у Віленскай дыяцэзіі іх налічвалася 12, а ў Пінскай дыяцэзіі – 14 [11, s. 395, 403, 404]. У гэты перыяд на тэрыторыі Заходняй Беларусі працавалі наступныя кангрэгацыі: Супольнасць Сясцёр Місіянерак Святой Сям’і (місіянеркі), Сясцёр Служабніц Езуса ў Эўхарыстыі (эўхарысткі), Сясцёр Святой Сям'і з Назарэту (назарэтанкі), Сясцёр Святога Арханёла Міхаіла (міхалі́ткі), Сясцёр Змёртвыхпаўстання Хрыста (змёртвыхпаўстанкі), Сясцёр Безаганнага Зачацця Найсвяцейшай Марыі Панны (непакалянкі), Сясцёр Місіянерак Каталіцкага Апостальства (палатынкі), Сясцёр Бенедыктынак, Сясцёр Уршулянак Канаючага Сэрца Езуса (уршулянкі), Сясцёр Міласэрнасці св. Вінцэнта дэ Поля (шарыткі), Сясцёр Сям'і Марыі.

Адной з асноўных форм працы жаночых манаскіх рымска-каталіцкіх супольнасцей была адукацыйна-выхаваўчая. Так, напрыклад, у кастытуцыі (асноўным законе кангрэгацыі) супольнасці назарэтанак, было прапісана, што яны павінны займацца адукацыйнай і апостальскай дзейнасцю сярод іўдзейскага, праваслаўнага і пратэстанскага насельніцтва [14, s. 14]. Канстытуцыя супольнасці місіянерак сведчыла, што адной з галоўных мэт яе заснавання з’яўляецца місіянерская праца сярод усходніх хрысціян, а таксама выхаванне і навучанне моладзі рэлігіі і свецкім навукам [12, s. 44].

У сістэме выхавання дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, важнай арганізацыямі былі яслі для сірот і дзіцячыя прытулкі. Манаскія супольнасці, якія працавалі на заходнебеларускіх землях у міжваенны перыяд, шмат увагі надавалі менавіта сіротам. Так, у 1925 г. у Слоніме місіянеркамі былі арганізаваны “Яслі св. Вінцэнта дэ Поля” для 30 сірот ва ўзросце да 7 год [12, s. 69]. У Пружанах законніцы той жа кангрэгацыі займаліся апекай двух прытулкаў: першы – для дзяцей ад 6 да 18 год, якіх было каля 100 асобаў, і другі – для падкінутых немаўлят, якіх было каля 20 [12, s. 65]. У 1930 г. у Брэсце місіянеркі арганізавалі дзіцячы прытулак для немаўлят, якіх прыносіла паліцыя, а часам іх падкідвалі [12, s. 63].

Акрамя яслей для сірот, законніцы ўтрымлівалі і дзіцячыя прытулкі. Напрыклад, у Брэсце місіянеркамі быў арганізаваны прытулак для сірот ва ўзросце ад 6 да 14 гадоў, прысланых сацыяльнай апекай [12, s. 63 ]. У 1936 г. у Баранавічах той жа супольнасцю быў адкрыты сірочы прытулак, фундатарам якога выступала каталіцкая дабрачынная арганізацыя “Карытас” [12, s. 73]. Супольнасць непакалянак адкрыла прытулак для сірот у Ракаве (Маладзечанскі павет). Згодна з архіўнымі дадзенымі, там жа ў 1930-ых гг. працавалі тры законніцы, якія прыбылі з Варшавы [11, s. 514].

Важнай працай, якой займаліся на заходнебеларускіх землях манаскія супольнасці – арганізацыя і ўтрыманне яслей і дзіцячых садкоў. Шмат дзіцячых устаноў выхаваўчага тыпу было адкрыта супольнасцю місіянерак. Так, у 1939 г. у Брэсце быў адкрыты дзіцячы сад на 50 асобаў, але восенню таго ж года будынак кляштара місіянерак быў пашкоджаны бамбардзіроўкай, а дзіцячы сад распушчаны [12, s. 63]. Вядома, што у Альбярціне (непадалёку ад Слоніма), Лагішчыне, Ашмянах, Канстанцінаве, Фабрычных Мастах (Ваўкавыскі павет) місіянеркі займаліся дзіцячымі садкамі. Колькасць выхаванцаў адрознівалася: так, у Пінску быў арганізаваны дзіцячы сад на 40 асобаў, а ў Гальшанах – на 45 дзяцей; у мястэчку Рось (Ваўкавыскі павет) – на 30 дзяцей [12, s. 71, 72 ]. Супольнасць сясцёр змёртвыхпаўстанак заснавала дзіцячы сад у Міры [11, s. 492]. Для насельніцтва каталіцкага і праваслаўнага веравызнання быў арганізаваны дзіцячы сад у Любчы (Навагрудскі павет). Тут працавала супольнасць сясцёр уршулянак, якая налічвала 9 законніц [11, s. 491].

У канстытуцыі амаль усіх супольнасцей уваходзіў пункт, які датычыўся адукацыі менавіта жаночай часткі насельніцтва. Выключэннем стала супольнасць міхалітак і то толькі з-за таго, што працавалі яны сумесна з айцамі і братамі міхалітамі. Супольнасць Святога Арханёла Міхаіла паўстала ў 1925 г. у Дзятковічах Баранавіцкага павету. Там сёстры міхаліткі разам з айцамі і братамі міхалітамі заснавалі ўстанову адукацыі для хлопчыкаў-сіротаў (якая менавіта ўстанова адукацыі не вядома). Колькасць навучэнцаў у 1936 г. складала 40 чалавек. Супольнасці мелі 469 га зямлі і леса, а таксама быў водны млын. Утрымлівалі адукацыйную ўстанову 2 ксяндзы, 4 законнікі і 4 сястры міхаліткі. Настаяцелем на той момант з’яўляўся айцец Вінцэнт Стахоўскі [11, s. 492].

Першапачатковую адукацыю можна было атрымаць у пачатковых школах. Адна з такіх школ была адчынена 2 верасня 1930 г. у Навагрудку супольнасцю назарэтанак [8, с. 8]. Наплыў дзяцей быў такі вялікі, што праз два гады паўстала неабходнасць узвядзення новага будынку школы [8, с. 36]. Пазней, у сярэдзіне 1933 г., пачатковая школа з дапамогай мясцовых жыхароў была перароблена [8, с. 8]. Быў узведзены двухпавярховы будынак, дзякуючы намаганням законніц і графа Яна Юндзіла-Балінскага [8, с. 36]. Згодна з архіўнымі дадзенымі, у 1936 г. у Навагрудку 17 сясцёр назарэтанак сваімі

уласнымі сіламі трымалі 6 класаў пачатковай школы, якія прыраўніваліся да дзяржаўных, справа была поўнасцю дабрачыннай. Пры школе сёстры трымалі пансіянат для вучаніц, якія паходзілі з ваколіц Навагрудка. Настаяцельніцай была Дэрус Дамініка-Юлія [11, s. 491]. Крыніцы сведчаць таксама аб арганізацыі супольнасцю сясцёр непакалянак бясплатнай пачатковай школы ў Слоніме [7, с. 48 ].

У міжваенны перыяд на заходнебеларускіх землях сярэднюю адукацыю можна было атрымаць у гімназіях. Адна з такіх гімназій была ўтворана яшчэ ў 1915 г. у Гродне супольнасцю назарэтанак. Выкарыстаўшы сітуацыю, што горад быў у нямецкай акупацыі, назарэтанкі адкрылі там гімназію. У 1919–1920 гг. яна размяшчалася на вуліцы Зялёнай, недалёка каля кляштара. Спачатку адкрыліся толькі два класа гімназіі, але колькасць жадаючых расла. У 1916–1917 навучальным годзе было 150 вучаніц, а ў 1919–1920 навучальным годзе колькасць вучаніц узрасла да 500. Пасля 1920 г. на базе гімназіі на тэрыторыі манастыра назарэтанкі адкрылі агульнаадукацыйную базавую школу, якая ў 1938 г. атрымала правы дзяржаўнай школы. У гімназіі, а потым у школе выкладалі як духоўныя асобы, так і свецкія. Гэтая школа функцыянавала да 1939 г. [13, s. 77]. У 1937/1938 навучальным годзе ў школе навучалася 168 хлопчыкаў і дзяўчынак. Школа рэгулярна атрымлівала датацыі ад магістрата Гродна. Так, у бюджэце горада на 1938–1939 гг. для яе была прадугледжана сума ў 1500 злотых [5, с. 452].

У 1923 г. у Друі (Дзісненсі павет) айцамі марыянамі А. Цікотам і А. Зянкевічам, сёстрамі эўхарысткамі Вандай Эўтэ і Уладыславай Вільчынскай былі адкрыты вячэрнія курсы для тых, хто жадаў вучыцца ў гімназіі. З часам курсы былі пераўтвораны ў класы гімназіі і ў кляштарных мурах была адчынена гімназія гуманітарнага профілю імя С. Баторыя. Адразу функцыі дырэктара выконвала В. Эўтэ, а яе намеснікам быў марыянін А. Цікота [3, с. 34]. Афіцыйна гэта была польская гімназія, хоць большасць навучэнцаў былі беларускамі і паходзілі з незаможных вёсак ды засценкаў. «Гэта была навучальная ўстанова з сумесным навучаннем, што стала своеасаблівым novum і таксама стварала некаторыя праблемы» [9, с. 16]. У гімназіі вучылася ад 100 да 140 навучэнцаў розных веравызнанняў. Тэрмін навучання складаў 6 год. Сёстры эўхарысткі не толькі апекаваліся гімназістамі, але і працавалі настаўніцамі [3, с. 35]. У 1928 г. навучанне перайшло на васьмікласную сістэму. У наступным гімназія павялічыла свае плошчы. Да яе былі дабудаваны фізічны зал, хімічны і прыродазнаўчы кабінеты, створана бібліятэка і чытальня [2, с. 125]. У гімназіі дзейнічаў хор, школьны аматарскі тэатр, гурток літаратараў, школа фотаздымкаў. У 1924–1933 гг. тут працавала 15 настаўнікаў, а ў наступных гадах іх колькасць павялічылася. На момант закрыцця ў гімназіі працавала ўжо 27 выкладчыкаў [10, с. 54].

Сёстры непакалянкі арганізавалі семінарыю імя Марцэліны Дароўскай ў Слоніме, якая давала сярэднюю спецыяльную адукацыю для дзяўчат. Семінарыя пачала сваю дзейнасць яшчэ ў кастрычніку 1919 г. На пачатку навучанне вялося на трох курсах, а ў 1922/1923 навучальным годзе дадаліся яшчэ два. У 1925/1926 навучальным годзе колькасць семінарыстак дасягнула 225 чалавек. Пры семінарыі таксама дзейнічала пяцікласная агульнаадукацыйная школа. Пазней дадзеная ўстанова адукацыі стала дзяржаўнай [1, с. 145]. Апошнім навучальным годам для слонімскай жаночай семінарыі стаў 1935/1936 навучальны год, паколькі ў гэты час у ІІ Рэчы Паспалітай ліквідаваліся ўстановы кляштарнага тыпу. Першай дырэктаркай пасля заканчэння савецка-польскай вайны (навучанне падчас вайны было прыпынена) была абрана непакалянка Хэлена Саподзька. Сярод выкладчыкаў у семінарыі было аддзінаццаць непакалянак, якія вучылі дзяўчат рэлігіі, нямецкай і французскай мовам, маляванню і спевам, працоўнаму навучанню, прыродазнаўству і геаграфіі [ 1, с. 146]. У 1936 г. кляштар у Слоніме налічваў 20 сясцёр непакалянак. Настаяцельніцай на той момант была Здзіслава Бельке [11, s. 491].

У міжваенны перыяд сёстры таксама працавалі ў дзяржаўных навучальных установах. Так, манахіні з супольнасці Сям'і Марыі ў 1937–1938 гг. працавалі ў дзяржаўнай гімназіі ў Драгічыне [11, s. 580, 581].

Трэба адзначыць, што супольнасці місіянерак, непакалянак, назарэтанак і эўхарыстак, якія працавалі на заходнебеларускіх землях арганізоўвалі таксама спецыяльныя курсы па атрыманню прафесій для жаночай часткі насельніцтва. Гэта былі кравецкія і ткацкія майстэрні, курсы крою вышывання і рукадзелля, вырабу трыкатажа. У гэтай справе асабліва вылучалася супольнасць сясцёр місіянерак, якая мела на тэрыторыі Заходняй Беларусі больш як 20 законных пляцовак. У Пінскай дыяцэзіі з мэтай навучання дзяўчат і жанчын прафесійным навыкам супольнасцю было заснавана тры майстэрні. Так, у Брэсце ў 1924 г. місіянеркамі была арганізована кравецкая майстэрня [12, s. 62]. У час сваёй працы ў 1930–1941 гг. у Крывошыне яны арганізавалі і ўтрымлівалі майстэрню пакрою і шыцця на 18 асоб [12, s. 70]. У Шэрашава ў 1921-1934 гг. (па іншых крыніцах – да 1938 г). супольнасць заснавала кравецкую майстэрню [12, s. 71].

У Віленскай дыяцэзіі такіх майстэрань налічвалася значна больш. Так, майстэрня шыцця і крою была арганізавана супольнасцю місіянерак у Гальшанах у 1931 г. [12, s. 72]. Курсы крою і шыцця законніцы праводзілі ў Ашмянах ад 1932 г. і да пачатку ІІ сусветнай вайны. Асобна тут была заснавана і майстэрня па вышыванню [12, s. 72 ]. Кравецкая майстэрня на 18 асоб жаночага насельніцтва знаходзілася ў мястэчку Рось (Ваўкавыскі павет) [12, s. 72]. Курсы кройкі і шыцця для 30 дзяўчат былі арганізаваны ў мястэчку Свір і дзейнічалі на працягу 1937–1940 гг. [12, s. 81]. Таксама кравецкая майстэрня знаходзілася ў Канстанцінаве і ажыццяўляла сваю дзейнасць на працягу 1935-1940 гг [12, s. 73]. Адзіныя кулінарныя курсы на 20 дзяўчат былі арганізаваныя ў Жукевічах у 1936-1937 гг. [12, s. 81].

Яшчэ ў 1908 г. ў Гродне назарэтанкамі была заснавана ткацкая майстэрня. Яна была потым адноўлена ў 1932 г. і дзейнічала да 1942 г. У ёй дзяўчаты займаліся не толькі ткацтвам, але рукадзеллем і вырабам трыкатажа. У майстэрні выкладала с. Натанаэлы Кіткевіч, якая скончыла Кракаўскую школу дэкаратыўнага мастацтва і мастацкіх рамёстваў [4, с. 324-325]. У 1929 г. у Навагрудку назарэтанкі таксама арганізавалі курсы рукадзелля. Сярод вучаніц былі дзяўчаты розных веравызнанняў і нацыянальнасцей [8, с.11].

У 1930-я гг. у Глыбокім дзейнічала трохгадовая кравецкая школа, арганізаваная супольнасцю сясцёр непакалянак. У 1936 г. тут працавалі 5 сясцёр, якія праводзілі заняткі. Таксама пры школе былі і курсы для дзяўчат [11, s. 514]. У гэты ж перыяд у Нясвіжы бенедыктынкамі была створана прафесійная школа для дзяўчат. Згодна з архіўнымі дадзенымі, у 1936 г. у школе налічвалася 100 вучаніц [11, s. 492].

Важным накірункам дзейнасці жаночых каталіцкіх манаскіх супольнасцей на заходнебеларускіх землях у міжваенны перыяд была дабрачыннасць. Сам характар манаскіх супольнасцей прадугледжваў дабрачыннасць як адзін з важнейшых накірункаў дзейнасці. Але асаблівасці і характар гэтай дзейнасці ў супольнасцей адрозніваўся. Так, у супольнасці сясцёр шарытак нават было прапісана ў канстытуцыі, што акрамя трох зарокаў (чысціні, беднасці і паслухмянства), яны склада чацвёрты – апека над хворымі. Так, у Гродне шарыткі арганізавалі шпіталь для невылечна хворых – Дом апекі св. Людвікі [11, s. 403]. Пад даглядам сясцёр у шпіталі ў 1936–1938 гг. знаходзілася 30 чалавек. шпіталь таксама падтрымліваў гарадскі

магістрат, выдзяляючы сёстрам не толькі гадавыя субсідыі, але і аднаразовыя датацыі і матываваў гэта тым, што «Пані міласэрнасці, дапамагаюць людзям у крайняй галечы і з'яўляюцца добрымі спецыялісткамі, але маюць абмежаваныя сродкі» [6, с. 341-342]. Медыцынскую дапамогу аказвалі і сёстры ўршулянкі. Так, згодна з архіўнымі дадзенымі ў Любчы супольнасць арганізавала медыцынскую клініку, у якой у асноўным аказвалі акушэрскія паслугі [11, s. 491-492]. Даглядам хворых у шпіталях і на даму займаліся назарэтанкі ў Навагрудку і місіянеркі ў Рачканах. Місіянеркі ў Пінску працавалі і жылі ў павятовай бальніцы па вуліцы Бернардзінскай (яна была падзелена на чатыры аддзелы і магла размясціць да 150 чалавек), а некалькі законніц працавалі ў шпіталі па вуліцы Стара-Ганчарскай [12, s. 71]. А ў Брэсце місіянеркі дапамагалі ў яўрэйскай бальніцы, дзе лячыліся таксама католікі і праваслаўныя [12, s. 63]. Пра дабрачынную дзейнасць назарэтанак ў Гродне ўзгадвае даследчыца Л.Міхайлік: "Яны апекаваліся састарэлымі жанчынамі ў сваім кляштары і штодзённа выдавалі пры кляштарнай браме каля 30 абедаў для бедных" [6, с. 362].

Некаторыя супольнасці стваралі спецыяльныя сталоўкі для таго, каб накарміць бедных. Місіянеркі арганізавалі такія сталоўкі ў Слоніме і Гальшанах, і ў Пінску на 30 асобаў. Супольнасць Сясцёр Місіянерак арганізавала прытулкі для бяздомных і састарэлых людзей. Так, у Брэсце быў створаны пансіянат для бяздомных жанчын па вул. Саборная, 9 у аднапавярховым будынку [12, s. 62], а ў Пінску – прытулак для састарэлых [12, s. 71].

Такім чынам, сярод важнейшых накірункаў дзейнасці жаночых манаскіх каталіцкіх супольнасцей на заходнебеларускіх землях у 1921-1939 гг. былі адукацыйная і дабрачынная. Сёстры стваралі ўласныя навучальныя ўстановы і арганізацыі адукацыйна-выхаваўчага кшталту, а таксама працавалі ва ўжо створаных. Сярод усіх навучальных устаноў, якія арганізавалі жаночыя манаскія супольнасці ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, вылучалася жаночая семінарыя ў Слоніме. Яна давала сярэднюю спецыяльную адукацыю. Таксама імі былі створаны гімназіі ў Друі (марыянамі і эўхарысткамі), і Гродне (назарэтанкамі). Важную ролю адыгралі кангрэгацыі і ў справе арганізацыі і дзейнасці сірочых яслей і прытулкаў. Значным унёскам таксама стала стварэнне прафесійных майстэрняў для жаночага насельніцтва. Аналізуючы дзейнасць жаночых рымска-каталіцкіх манаскіх супольнасцей у гэтай сферы, неабходна адзначыць іх важкі уклад у развіццё адукацыйнай прасторы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Таксама вылучаліся супольнасці сваёй дабрачыннай дзейнасцю і, перадусім, у апекай над хворымі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Герасімчык, В. У. Жаночая семінарыя імя М. Дароўскай у Слоніме (1919–1936) / Герасімчык В. У. // Адукацыя на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 30 – 31 сакавіка 2010 г. / [рэдкалегія: В. У. Акуневіч (адказны рэдактар) і інш.]. – Віцебск, 2010. – С. 144 – 147
2. Каржанеўская, Ю.І. Дзейнасць орэна марыянаў на Беларусі з 1923 па 1938 год/ Ю.І. Каржанеўская // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета. – Выпуск 15. – 2006. – С. 124–126.
3. Каржанеўская, Ю.І. Гімназія імя С. Баторыя ў Друі ў 1923–1938 гг. / Ю.І. Каржанеўская // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета. – Выпуск 20. – 2007. – С. 34–37.
4. Маліноўская, Т.Р. "Гродзенскі брыгітскі кляштар і назарэтанкі (1790-я – 1930-я гг.) / Т.Р. Маліноўская, Н.А. Маліноўская-Франке // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : Х 12 зб. навук. арт. : у 2 ч. Ч. 2 / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Э.С. Ярмусік [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 320-326
5. Міхайлік Л. Каталіцкі Касцёл у грамадскім і палітычным жыцці Гродна ў 1921 – 1939 гг. / Л. Міхайлік // Гарадзенскі палімпсест. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2011. – С. 444-462.
6. Міхайлік Л. Праблема сацыяльнага забеспячэння ў Гродне ў 1921 – 1939 гг. / Л. Міхайлік // Гарадзенскі палімпсест. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. // Пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Мінск : Зміцер Колас, 2012. – С. 341-368
7. Пра пакліканне. Ружанцовыя разважанні. – Камісія па справах Божага культу і дысцыпліны сакрамэнтаў пры КПББ. – Мінск: Про Хрысто, 2005. – 202 с.
8. Стажиньская, М. Одиннадцать мучениц /М. Стажиньская (перевод с польского: Лариса Михайлик). – Гродно: Гроднен. Рим.-Катол. Епархия, 1999. – 74 с.
9. Троян, К. Марыяне на Беларусі / К. Троян // Хрыстос–марыяне–Беларусь; Рэд. К. Пэка. – Мінск: Про Хрысто, 2005. – С. 7–26.
10. Туронак, Ю. Беларускія марыяне ў Друі / Ю. Туронак // Спадчына. – 1991. – №5. –С. 51–56.
11. Archiwum Akt Nowych w Warszawe. Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświaty Publicznej. Zakony – sprawy ogólne – wykazy zakonów i informacje o działalności nadsyłane przez urzędy wojewódzkie 1922-1938. Sygnatura 906.
12. Bar, J. Zgromadzenie Siostr Misjanarek Swiętej Rodziny / J. Bar. – Rzym, 1975. – 117 s.
13. Górska, T. 100 lat Sióstr Nazaretanek / T. Górska – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.niedziela.pl/artykul/1561/100-lat-Siostr-Nazaretanek-w-Grodnie. – Дата доступа: 01.10.2021
14. Zgromadzenie Najświętszej Rodziny z Nazaretu. Pierwsze pięćdziesięciolegie jego istnienia 1875-1925. – Rzym, Drukarnia Watykańska, 1925. – 81 s.